# ПРЭЗІДЭНТ ПРЫНЯЎ ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРА

**Як паведамілі БЕЛТА з прэс-службы Прэзідэнта, 28 ліпеня 1999 года А. Р. Лукашэнка прыняў са справаздачай прэм'ер-міністра С. С. Лінга.**

Кіраўнік урада праінфармаваў прэзідэнта аб сустрэчах з кіраўніцтвам Краснадарскага края і падпісанні пратакола практычных мераў па рэалізацыі ўзаемных паставак паміж гэтым рэгіёнам Расійскай Федэрацыі і Рэспублікай Беларусь. У адпаведнасці з дакументам, у прыватнасці, прадугледжваюцца пастаўкі ў Беларусь 200 тысяч тон збожжа, круп, алею, прадукцыі вінаробства, кансерваў і г.д. на агульную суму 1 мільярд расійскіх рублёў. Расійскі рэгіён, у сваю чаргу, зацікаўлены ў атрыманні з Беларусі трактароў, кормаўборачных комплексаў, іншай сельскагаспадарчай тэхнікі, будаўнічых матэрыялаў, прадукцыі хімічнай і лёгкай прамысловасці. Кіраўнік дзяржавы паставіў перад урадам задачу ўзяць на кантроль ход рэалізацыі ўзаемных паставак.

Прэм'ер-міністр далажыў прэзідэнту аб бягучай рабоце ўрада. У прыватнасці, было падкрэслена, што адной з прыярытэтных задач цяпер з'яўляецца забеспячэнне жніва гаруча-змазачнымі матэрыяламі. З расійскім бокам дасягнута дамоўленасць аб пастаўках у Беларусь 2,9 мільёна тон нафты на працягу трэцяга квартала. Абмяркоўваліся таксама меры, якія прымае ўрад па забеспячэнню рэспублікі газам і іншымі відамі паліва. Прэзідэнт звярнуў увагу на неабходнасць выканання рэжыму самай строгай эканоміі энерганосьбітаў усімі суб'ектамі гаспадарання, шырокага выкарыстання мясцовых відаў паліва, прыняцця дадатковых мераў па энергазберажэнню ў перыяд падрыхтоўкі да зімы.

Прэзідэнту далажана аб разглядзе на прэзідыуме Саўміна пытанняў, звязаных з выканальніцкай дысцыплінай. Асаблівая ўвага была ўдзелена недапушчэнню затрымак з выплатай заработнай платы, а таксама мерапрыемствам па закладцы прадуктаў харчавання на зіму ў Мінску і абласцях рэспублікі. Яшчэ адной тэмай даклада стала работа ўрада над папраўкамі да бюджэту, накіраванымі на скарачэнне расходаў. Прапановы наконт гэтага будуць унесены на разгляд прэзідэнту 15 жніўня гэтага года.

С. С. Лінг праінфармаваў А. Р. Лукашэнку аб змяненнях у размеркаванні абавязкаў сярод віцэ-прэм'ераў. Ён паведаміў аб маючай адбыцца паездцы ў Магілёўскую вобласць, дзе мае намер азнаеміцца з ходам ўборачных работ у рэгіёне, выкананнем бюджэту, работай Магілёўскага металургічнага завода.

**БЕЛТА.**

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь